**УДК 94(476) + 323.15 (476)**

*Ігар Пушкін*

# *НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ КАЛАБАРАЦЫЯНІЗМА Ў БЕЛАРУСІ ПАДЧАС ВАЙНЫ 1941–1945 ГГ.*

*У статті досліджується національно-культурна політика німецьких окупантів на території сучасної Білорусі під час Другої світової війни та різноманітні форми співробітництва частини населення колишньої радянської республіки з окупантами. Вивчення дійсних реалій того часу має велике значення для встановлення історичної правди та коректного формування політики історичної пам'яті.*

*Потрібно відмітити наступні форми співробітництва частини населення з окупантами: політична колаборація. До політичних колаборантів відносимо тих людей, які працювали у створених оккупантами або з їхньою допомогою місцевих адміністративних органах (старости, бургомістри, юденрати, тощо), громадських організаціях, були допоміжними співробітниками німецьких окупаційних органів. Воєнна колаборація: а) місцевий поліційний апарат, служба порядку, допоміжні охоронні поліцейські формування, залізничні батальйони, «східні» батальйони, козачі формування, агенти абвера, СД, ГФП, поліція, допоміжні будівельні ті інші частини; б) місцева самооборона (БКС, БКО), формування польської армії та української ОУН–УПА, які співробітничали із німцями, члени оборонних військових поселень, російські козачі частини, підрозділи Камінського. Економічна (господарська) колаборація включала керівників і службовців господарських органів, підприємств та організацій, які функціонували в роки війни, безпосередньо чи опосередковано працюючи на окупантів.*

*У період окупації спостерігалися відмінності у ставлені національних груп населення до окупантів та співробітництва з ними у різних частинах Білорусі. Найбільш активними у одних регіонах країни були білоруси та росіяни, в інших – поляки та українці. Найменшу активність проявляли татари.*

*Зроблено висновки, що частина білорусів і представників національних меншин Білорусі були у складі усіх груп колабораціоністів.*

*Ihar Pushkin*

# *NATIONAL PECULIARITIES OF COLLABORATIONISM IN BELARUS DURING THE WAR OF 1941–1945*

*The article deals with the national cultural policy of the invaders on the territory of modern Belarus and various forms of co-operation of the population against the invaders.*

*It may be noted the following forms of cooperation of the part of the population with the occupiers. The political collaboration – those who worked in local administrative bodies created by the invaders or with their help (elders, burgomasters, Judenraths, etc.), public organizations, were auxiliary employees of the German occupation organs. Military collaboration: a) local police, law enforcement, auxiliary security police units, railway battalions, "eastern"*

*battalions, Cossack formations, agents of the Abwer, SD, GUF, police, auxiliary construction and other parts; b) local self-defense (BKS, BSA), the formation of the Polish army (AK) and the Ukrainian OUN-UPA, who collaborated with the Germans, members of the defensive military settlements, the Russian Cossack military units, Kaminsky army. The economic (economic) collaboration included the heads and employees of economic bodies, enterprises and organizations that functioned during the war years, working directly or indirectly for the occupiers.*

*During the occupation, there were differences in the situation of national groups in different parts of Belarus. The most active in some regions of the country were Belarusians and Russians, while others were Poles and Ukrainians. The Tatars showed the least activity.*

*It is concluded that the composition of the different groups of collaborators in Belarus were representatives of various nationalities and ethnic groups.*

***Keywords:** Collaboration, Belarus, Second World War, cooperation with the occupiers*

**Уводзіны.** Летам 2019 г. спаўняецца 75 гадоў вызвалення тэрыторыі Беларусі ад гітлераўскіх акупантаў. На постсавецкай прасторы актыўна ідзе працэс асэнсавання вынікаў Другой сусветнай вайны, асабліва ўдзелу насельніцтва ў падзеях на акупаваных тэрыторыях. Формы і метады супрацоўніцтва з гітлераўцамі, а таксама, дзейнасць беларусаў у складзе партызанскага і падпольнага супраціву, у большасці сваёй даследаваны. Наша мэта – раскрыць удзел у калабарацыянісцкім руху іншых этнічных груп Беларусі. Існуючыя публікацыі асвятляюць гэты працэс не ў поўным аб'ёме.

Значным унёскам у даследаванне жыцця нацыянальных супольнасцей Беларусі падчас гітлераўскай акупацыі з'явіліся працы В. Барабаша [1], А. Беляева [2], С. Грыбавай [5], Э. Іофе [6], А. Кавалені і А. Калеснікавай [7], Д. Крывашэя [10], А. Мацко [8], А. Котава [9], І. Пушкіна [17; 18], У. Тугая і У. Грыгор'ева [21], Ю. Туронка [22], Г. Шышковай [23].

Аналіз удзелу нацыянальных супольнасцей Беларусі ў грамадскім і культурным жыцці падчас вайны мае шэраг складанасцей з-за адсутнасці поўнай дакументальнай базы. Дзейнасць прадстаўнікоў розных этнічных супольнасцей залежыла ад палітыкі гітлераўскіх акупантаў ва ўмовах тэратарыяльнага падзелу Беларусі.

У Беларусі пад акупацыяй засталіся каля 8 млн жыхароў і 900 тыс. ваеннапалонных. Згодна планаў ваенна-тэрытарыяльнага падзелу акупаваных рэгіёнаў СССР, германскія акупацыйныя ўлады імкнуліся раздрабніць этнічную цэласнасць Беларусі. У выніку такога ваенна-палітычнага падыходу беларуская тэрыторыя была падзеленая і ўвайшла ў розныя тэрытарыяльна-акупацыйныя адзінкі. Усходнія раёны (Віцебшчына, Магілёўшчына, амаль уся Гомельшчына) з'яўляліся часткай тылу групы армій "Цэнтр." Цэнтральныя раёны належылі да генеральнай акругі "Беларусь" рейхскамісарыята "Остланд". Частка паўночна-заходніх аднесена да генеральнай акругі "Літва". Заходнія раёны Гродзеншчыны, Беласточчына, паўночныя раёны Брэстчыны былі ўключаны ў акругу "Беласток", якая з'ўлялася часткай Усходняй Прусіі. Паўднёвыя раёны тагачасных Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей увайшлі ў рэйхскамісарыят "Украіна".

У выніку ваенных дзеянняў на тэрыторы Беларусі апынуліся прадстаўнікі розных народнасцей СССР і нават іншых краін, а таму паўстае пытанне ці патрэбна разглядаць іх як прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей Беларусі. Прычым як ў складзе савецкіх партызан, так і ў складзе рускіх, латышскіх, украінскіх калабарацыянісцкіх (паліцэйскіх) частак. Цяжка паддаецца аналізу ўдзел нацыянальных супольнасцей Беларусі ў складзе Чырвонага (савецкага) войска, як на тэрыторыі Беларусі падчас ваенных дзеянняў 1941, 1943–45 гг., так і на акупаванай і неакупаванай тэрыторыі СССР. Цяжкасці і складанасці, з-за адсутнасці дакладных звестак, узнікаюць пры аналізе ўдзелу нацыянальных супольнасцей БССР у дзейнасці калабарацыйных органаў, антыгітлераўскіх і антысавецкіх аб'яднанняў (АК, "батальёны хлапечыя" і г.д.), арміі генерала У. Андэрса. Усё гэта і вызначае актуальнасць даследавання, якое дазваляе асвятліць некаторыя нацыянальныя асаблівасці калабарацыянізму ў Беларусі падчас вайны 1941–1945 гг.

**Асноўная частка.** На тэрыторыі Беларусі акупацыйныя ўлады здзяйснялі нацыянальную палітыку, якая была накіравана на дамінаванне германскай расы, анямечванне і эксплуатацыю часткі славянскага насельніцтва, генацыд (яўрэяў, цыганоў).

Знішчаючы яўрэяў (па розных дадзеных за час вайны ў Беларусі было знішчана ад 600 да 810 тыс. яўрэяў [3, с. 99; 6, с. 162; 20, с. 323]) і ўсіх не згодных з іх дзеяннямі (Беларусь за гады вайны страціла трацiну свайго насельніцтва), праводзячы палітыку германізацыі, акупанты ў той жа час стваралі ўмовы для пэўнага эканамічнага і сацыяльна-культурнага жыцця не яўрэйскай часткі насельніцтва. Гэта паспрыяла таму, што нацыянальнае жыццё часткі насельніцтва Беларусі ажывілася.

У першыя месяцы акупацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі была разгорнута кампанія па "аднаўленню польскасці" (стварэнне школ, назначэнні на пасады і г.д.). Затым нацыянальная палітыка акупантаў мяняецца, вясной 1942 г. на тэрыторыі Беларусі акупанты разгортваюць антыпольскую кампанію тэрору [1, с. 205-206]. Стаўка робіцца на этнічныя меншасці былой Польшчы (у акрузе "Літва" на літоўцаў, "Беларусь" на беларусаў). Аказваючы падтрымку нацыянальным рухам, гітлераўцы не надавалі ім сур'ёзных ўладных паўнамоцтваў. Аднак пасля паразы пад Масквой і актывізацыі партызанскага руху гітлераўскія акупанты пайшлі насустрач мясцовым калабарацыяністам і дазволілі стварэнне ваеніза-ваных фармаванняў. Тыя, хто пайшоў на

супрацоўніцтва з гітлераўцамі, працавалі ў створаных акупантамі або з іх дапамогай мясцовых адміністратыўных органах, грамадскіх арганізацыях, з’яўляліся дапаможнымі супрацоўнікамі нямецкіх акупацыйных органаў. Частка з іх уваходзіла ў мясцовы паліцэйскі апарат, службу парадку, дапаможныя ахоўныя паліцэйскія фармаванні, карныя батальёны і іншыя часткі [4, с. 511].

Нацыянальна-культурная палітыка акупантаў на тэрыторыі Усходняй Беларусі, якая кантралявалася ваенным камандаваннем і ўваходзіла ў склад тылавых раёнаў групы армій “Цэнтар”, значна адрознівалася ад той, што праводзілася на тэрыторыях, якія знаходзіліся пад кантролем цывільнай адміністрацыі. Тылавыя раёны армій разглядаліся ў якасці мясцовасцей, дзе адбывалася разгортванне рускіх калабарацыянісцкіх ваенных фармаванняў, у прыватнасці 19.09.1941 г. у Магілёве быў створаны і прысягнуў на вернасць Гітлеру 120-ы данскі казацкі полк. Таму асновай прапагандысцкай апрацоўкі насельніцтва з’яўляўся пад’ём рускага духу [10, с. 123]. Рускае насельніцтва вяло актыўнае нацыянальнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё, былі створаны Нацыянальны камітэт самадапамогі, Саюз рускай моладзі, школы, выдаваліся газеты на рускай мове.

На нашу думку, грамадскае і культурнае жыццё Беларусі часоў гітлераўскай акупацыі выяўляецца, з аднаго боку, як барацьба з гітлераўскімі захопнікамі, з другога – супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі. У якасці прыкладу палітычнай і эканамічнай калабарацыі ў тылавой частцы армій групы “Цэнтар” можна разгледзець сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі.

Захопнікі канчаткова авалодалі Магілёвам толькі 28.07.1941г. Яўрэйскае насельніцтва павінна было пражываць на тэрыторыі гета і падлягала поўнаму знішчэнню. На тэрыторыі Магілёва было знішчана каля 10–14 тыс яўрэяў. Згодна перапісу неяўрэйскага насельніцтва, у Магілёве на 01.10.1941 г. пражывала 47 048 чалавек, з іх 28758 жанчын і 18290 мужчын, 16785 дзяцей да 14 год, 2864 асобы старэйшыя за 60 год, працаздольнага насельніцтва каля 27,5 тысяч (мужчын каля 9000). Па нацыянальнасці: рускіх – 28705, беларусаў – 15707, украінцаў – 1085, палякаў – 1063, немцаў – 82, эстонцаў – 13, латышоў – 192, літоўцаў – 72 і іншых – 129 [11, арк. 3–3адв.]. Нацыянальныя меншасці Беларусі складалі 66,62 %. Летам 1942 г. у горадзе жыло крыху болей за 50000.

Пры гарадскім упраўленні Магілёва былі ўтвораны некалькі аддзелаў: медыка-санітарны, адукацыі, агульна-тэхнічны і г.д. Яны курыравалі розныя бакі дзейнасці і жыцця насельніцтва горада. Так, пры агульна-тэхнічным аддзеле існавалі восем пададдзелаў з назваў якіх бачна якой справай яны займаліся: будаўнічы, санітарна-тэхнічны, электраэнэргетычны, дарожны, азелянення і добраўпарадкавання, вадаправоду і каналізацыі, грамадскіх работ і інш. Некаторыя з іх прызначаліся для забеспячэння патрэбаў гітлераўцаў (напрыклад, пра якое электраасвятленне дамоў жыхароў магла ісці размова, калі ў 1942 г. спецыяльным загадам акупацыйныя ўлады адключылі грамадзянскае насельніцтва ад электрасеткі), іншыя дзейнічалі на карысць усіх.

Усё працаздольнае насельніцтва горада (з 16 год) павінна было працаваць. Пенсіянеры са снежня 1941 г. атрымоўвалі штомесяц дапамогу (каля 50 руб., для параўнання, санітарка ў бальніцы зарабляла 200 руб., дырэктар торфазавода – 800 руб., артыст тэатра – 1000 руб.). Для тых, хто не атрымаў працу на прадпрыемствах арганізовываліся грамадскія працы. Разлік за выкананую працу з імі рабіўся штодзень.

Падчас акупацыі ў Магілёве была часткова ці цалкам наладжана работа наступных прадпрыемстваў і ўстаноў: заводаў газіраванай вады, піваваранага, трубаліцейнага, гарбарнага, лесахімічнага, аўтарамонтнага, цагляна-дахоўнага “Днепр”, косцеклеявага, пяці цагляных, торфазавода, металакамбіната “Дзімітрава”, чыгункі, фабрык шаўковай і мэблева-сталярнай, мясакамбіната, ТЭЦ (на іх працавала ад 20 да 300 чалавек на кожным), гарадской бібліятэкі, васьмі школ, рамесніцкага і будаўнічага вучылішч, 7 сталовак, прыватных кавярняў і цырульняў, 3 лазняў, гарадскога тэатра, гарадской бальніцы, паліклінікі з філіяламі, дыспансераў (сухотны і венерычны), санітарна-эпідэмічнай станцыі, хлебапякарняў, аптэк і г.д. [2, с. 307–314; 19, с. 228–237]. Дзейнасць медыцынскіх устаноў даволі падрабязна асвятлена [17; 18]. У Магілёве працавала метэаралагічная станцыя, якая перыядычна паведамляла прагноз надвор’я.

У сувязі з тым, што існавала вельмі простая сістэма падаткаабкладання – 10% ад даходу, большага за 200 руб., шмат хто займаўся прыватным гандлем, рамесніцтвам. З 1942 г. у горадзе дзейнічала 10 прыватных кавярняў, 11 цырульняў, летам было выдадзена 5 патэнтаў на выраб і продаж марожанага [14, арк. 1].

З мэтай найлепшага сацыяльнага забеспячэння патрэбаў работнікаў на цагляным заводзе, ТЭЦ, піўзаводзе, металакамбінаце, торфазаводзе “Грабянёва”, аўтарэмзаводзе, шаўковай фабрыцы, у бальніцы, псіхлячэбніцы існавалі сталоўкі, а на трубаліцейным заводзе (1942), Магілёўскай ТЭЦ (1943) былі арганізаваны яслі для немаўлятак работніц гэтых прадпрыемстваў. На працягу 1941–1943 гг. у горадзе дзейнічала малочная дзіцячая кухня. У маі і чэрвені 1942 г. кухня забяспечвала неабходным дзіцячым харчаваннем 160 дзетак. У Магілёве летам 1942 г. у цэнтры горада былі адноўлены 6 вадаправодных магістраляў (3 артэзіянскія свідравіны), у іншых месцах для забеспячэння насельніцтва вадою былі зроблены 30 калодзежаў.

Любая грамадская і культурна-асветная дзейнасць без дазволу акупацыйных уладаў забаранялася. Яна была магчыма толькі ў рэчышчы падтрымкі дзеянняў гітлераўцаў. Адной з першых грамадскіх арганізацыяў было "Таварыства Чырвонага Крыжа", утворанае ў студзені 1942 г. Але вельмі хутка яно змяніла назву на "Таварыства пацярпелых ад вайны". З красавіка 1943 г. яно стала звацца "Таварыства Беларускай народнай самапомачы ў г. Магілёве" і налічвала каля 700 чалавек [15, арк. 10–11, 29].

У 1942–1943 гг. у Магілёве ўрачыста святкавалі: 1 мая – свята працы, 22 чэрвеня – дзень вызвалення ад бальшавізму, у школах ладзіліся "навагоднія елкі" [12; 13]. Каля паўтара дзесяткі тысячаў чалавек было на мітынгу і агульнагарадскіх "гуляннях", якія адбыліся на Тэатральнай плошчы горада 22.06.43 г. У той жа час, значная частка гараджан ухілялася ад удзелу ў падобных мерапрыемствах.

У 1942/43 навучальным годзе ў Магілёве працавала 8 школ (1 чатырох-гадовая, 4 сямігадовых і 3 васьмігадовых з камерцыйным і справаводчым прафесійнымі ўхіламі). Сярод іх было 5 беларускіх і 3 рускія, у якіх выкладалі 146 настаўнікаў (120 беларусаў, 71 з вышэйшай адукацыяй) і вучыліся 3963 вучня. У праграмах усіх школ адсутнічаў такі прадмет як гісторыя. Сцвярджалася, што "Берлін – сталіца нашай радзімы". Пры вывучэнні твораў рускай літаратуры з дарэвалюцыйных паэтаў і пісьменнікаў у школьных праграмах былі шырока прадстаўлены ўсе без выключэння класікі, а з савецкіх дазваляўся толькі "Ціхі Дон" М. Шолахава. Па беларускай літаратуры ў праграме засталося вывучэнне твораў М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Ядзвігіна Ш, Ц. Гартнага, К. Буйло і інш. У горадзе дзейнічалі рамеснае і будаўнічае вучылішчы, платная музычная школа. 13.05.1943 г. у Магілёве ў памяшканні былой фельчарскай школы распачаў сваю працу медыцынскі інстытут [19, с. 228–237; 22, с. 222].

У красавіку 1943 г. у горадзе працавалі кароткатэрміновыя курсы каморнікаў, у чэрвені – прапагандыстаў РВА. Ладзіліся рамесна-саматужніцкія выставы, непрацяглы час працавала гарадская бібліятэка, з якой былі канфіскаваны кнігі савецкіх аўтараў. Дзейнічалі 7 клубных устаноў, у якіх ладзіліся "танцы" для моладзі. Кожны дзень дэманстраваліся кінафільмы ў кінатэатрах "Зорька" і "Луч".

25.12.41 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё Магілёўскага драматычнага тэатра. Руская тэатральная трупа з 18 артыстаў за 2 гады здзейсніла 15 буйных пастановак на рускай мове. Сярод іх: "Коварство и любовь", "Без вины виноватые", "Хозяйка гостиницы", "Свадьба Кречинского", "Гроза", "Бесприданница" і інш. Тэатр у Магілёве паказаў гледачам 142 спектаклі (45000 наведванняў). Трупа выязджала на гастролі ў Оршу і Чавусы. У 1943 г. у горадзе быў створаны дзіцячы тэатр, які паказаў гледачам п'есы "Дорогая гостья", "Жар-птица", музычную інсцэніроўку "Свята кветак". Квіткі на вечаровыя спектаклі з'яўляліся пропускамі пасля каменданцкай гадзіны.

У гады акупацыі ў Магілёве былі створаны і выступалі з канцэртамі: ансамбль народных інструментаў, дзіцячы хор вучняў музычнай школы, хоры Мікалаеўскага сабора і Барыса-Глебскай царквы, калектыў гарадской эстрады, духавы аркестар службы парадку. Вельмі часта іх можна было пачуць па магілёўскім радыё. Магілёўскія паэты друкавалі свае вершы ў мясцовых газетах. Выдаваліся на рускай мове газеты "Новый путь" і "Последние известия". Цікавай і разнастайнай была праграма штодзённага мясцовага радыё, якая публікавалася ў мясцовым друку. Вяшчанне вялося праз узмацняльнікі на вуліцах горада з 6.30 да 21 гадзіны [19, с. 228–237; 13].

Акупацыйныя ўлады далі дазвол на правядзенне набажэнстваў у шэрагу хрысціянскіх храмаў, якія былі гвалтоўна закрыты ў 1930-я гг. савецкай уладаю. У Магілёве распачалі працу Трохсвяціцельскі кафедральны сабор, Барыса-Глебская царква, Петра-Паўлаўская царква, Іоана-Багаслоўская царква на Машэкаўскіх могілках, праваслаўная царква на Успенскіх могілках, з 12.12.1941 г. рыма-каталіцкі касцёл. У горадзе ў 1942 г. налічвалася 8 святароў і дыяканаў. Праваслаўны архіепіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Філафей браў актыўны ўдзел у Мінскім саборы епіскапаў Беларускай Праваслаўнай царквы (11–17.05.1944 г.) [16, арк. 2–11адв.].

Акупацыя Беларусі, яе тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел спрыялі актывізацыі дзейнасці розных нацыяналістычных сіл. Беларускія нацыяналісты імкнуліся выкарыстаць магчымасці, якія з'явіліся ва ўмовах германскай акупацыі, для рэалізацыі сваіх даўніх ідэй нацыянальнай дзяржаўнасці.

На захадзе Беларусі вялікую працу разгарнулі польскія нацыяналісты. Вядомы выпадкі, калі пэўныя прадстаўнікі польскага насельніцтва сустракалі гітлераўскіх захопнікаў хлебам-соллю, абстрэльвалі адступаючыя часткі Чырвонай Арміі. Напрыклад, у Пінску, Нясвіжы, Лунінцы. Лідары польскага падполля, маючы далёка ідучыя мэты, з першых дзён акупацыі Заходняй Беларусі імкнуліся заняць кіруючыя месцы ў мясцовай акупацыйнай адміністрацыі.

Польскія лідары і камандзіры Арміі Краёвай (АК) разглядалі Заходнюю Беларусь як частку будучай польскай дзяржавы. Палякі былі ў значнай колькасці прадстаўлены ў мясцовай адміністрацыі. Для дасягнення сваёй мэты выкарыстоўвалі даносы і правакацыі ў адносінах да беларусаў, украінцаў і яўрэяў. Змагаючыся з гітлераўцамі атрады АК у той жа час нападалі на беларускія вёскі і партызан. Вядома супрацоўніцтва АК з гітлераўцамі ў барацьбе супраць беларускіх, савецкіх партызан. Варта адзначыць, што немцам не ўдалося стварыць

калабарацыянісцкай фармаванні, якія складаліся толькі з польскага насельніцтва.

У паўднёвых раёнах Беларусі дзейнічала Арганізацыя ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН-УПА). Можна адзначыць актыўную і плённую дзейнасць культурна-асветніцкага таварыства "Просвіта", развіццё ўкраінскага тэатра, клубаў і гурткоў, нацыянальнага друку. Імкненне да самавызначэння ўкраінскага народа выклікала рост напружання і варожасці паміж акупантамі і ўкраінскім насельніцтвам на апошнім этапе акупацыі.

Камандуючы мясцовымі паліцэйскімі сіламі адзначаў, што "па нацыянальным складзе, асабліва ў заходніх абласцях Беларусі, у паліцыі службы парадку знаходзілася шмат палякаў, а таксама вялікаросаў і ўкраінцаў, якія пры адыходзе савецкага войска змяшаліся з мясцовым насельніцтвам і пазней выдавалі сябе за беларусаў" [8, с. 49].

У Беларусі дзейнічалі калабарацыянісцкія батальёны "Дзвіна", "Бярэзіна", "Волга", "Дняпро", "Прыпяць", так званыя ўсходнія батальёны, казацкія сотні, французскі полк.

У ліпені 1941 г. у Мінску быў сфарміраваны асобны паліцэйскі батальён службы парадку колькасцю ў 910 чалавек, які складаўся з вызваленых ваеннапалонных украінскай нацыянальнасці. У гады акупацыі ў Беларусі знаходзіліся ўкраінскія, літоўскія, латышскія і эстонскія паліцэйскія батальёны. Яны выкарыстоўваліся для аховы камунікацый, барацьбы з партызанамі, а таксама ўдзельнічалі ў масавым знішчэнні мірнага насельніцтва (яўрэяў, цыганоў і інш.). У прыватнасці ў Магілёве аховай найбуйнейшага канцлагера ў горадзе (знішчана больш за 40 тыс. ваеннапалонных і мірнага насельніцтва) – Лупалаўскага, займаўся "украінскі" 51-ы ахоўны батальён. Па стану на 29.02.1944 г. начальніку СС і паліцыі "генеральнай акругі Беларусь" непасрэдна падпарадкоўваліся наступныя паліцэйскія фарміраванні калабарантаў: Баранавіцкі паліцэйскі ўчастак мясцовай паліцыі (26 чалавек), 7 беларускіх паліцэйскіх батальёнаў у Слоніме, Мінску, Баранавічах, Глыбокім, Навагрудку, Слуцку, Лідзе (агульнай колькасцю 2167 чалавек); 5 украінскіх у Мінску, Гарадзішчы, Капылі, Слоніме, Лідзе (2239 чалавек): 3 літоўскія ў Параф'янаве, Мінску, Старобіне (1400 чалавек), латышскі ў Докшыцах (271 чалавек) [20, с. 322; 1, с. 208].

Пераважна латышамі было ўкамплектавана спецыяльнае падраздзяленне вышэйшага начальніка СС і паліцыі Остланда, якое дыслацыравалася пры Мінскім СД. Галоўнай яго задачай было аказанне дапамогі ў барацьбе супраць антыгітлераўскага падполля і партызанскага руху, а таксама актыўны ўдзел у акцыях знішчэння яўрэйскага насельніцтва Беларусі. У розны час на тэрыторыі Беларусі знаходзіліся і ўдзельнічалі ў карных аперацыях , таксама, 15-ты, 17, 18, 24, 25, 26, 208, 266, 268, 271, 432 і іншыя латышскія паліцэйскія батальёны. Як адзначаюць даследчыкі У. Тугай і У. Грыгор'еў: "У гістарычнай памяці беларускага народа аб латышскіх паліцэйскіх батальёнах, што ў розны час дыслацыраваліся на тэрыторыі Беларусі, засталіся негатыўныя звесткі і ўспаміны як аб карніках, якія вылучаліся лютасцю і жорсткасцю ў адносінах да беларусаў" [21, с. 51].

З верасня 1943 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі два рускія ўзброеныя фарміраванні: паліцэйская 10-тысячная брыгада СС Б. Камінскага – так званая Руская вызваленчая народная армія (РВНА) і 2,5-тысячная паліцэйская брыгада Гіль-Радзівонава. Пяць палкоў РВНА размясціліся ў Лепелі, Сянно, Бешанковічах, Чашніках. Яны прынялі непасрэдны ўдзел у карных аперацыях гітлераўскіх акупантаў "Рэгеншауэр", "Свята вясны" (красавік – май 1944 г.) і амаль цалкам ачысцілі Лепельшчыну на Віцебшчыне ад савецкіх партызанскіх атрадаў. За ўдзел у гэтых аперацыях Б. Камінскі быў узнагароджаны жалезным крыжом I класа [9, с. 97–100]. У барацьбе з савецкімі партызанамі ўдзельнічалі воінскія падрадзяленні рускіх казакаў, якія служылі гітлераўскім акупантам, напрыклад, у Навагрудскім раёне.

Адным з цэнтраў рускіх калабарантаў быў Бабруйск. Нацысты ў горадзе стварылі рускія нацыяналістычныя арганізацыі. Туды накіравалі рускіх калабарантаў з Арла і Смаленска, у горад пераехалі нацысцкія газэты „Новый путь“ і „Речь“. Тут дзейнічаў адзін з галоўных нацысцкіх прапагандыстаў М. Актан. Ён стварыў у Бабруйску Саюз барацьбы супраць бальшавізму. Там жа быў створаны Саюз рускай моладзі, куды рэкрутавалі і запрашалі беларускіх хлопцаў і дзяўчат.

У асобных раёнах Беларусі вялася актыўная дзейнасць літоўскіх калабарантаў, асабліва тых, што прыбылі з Ковенскай Літвы. Літоўскія калабаранты (фарміраванні генерала П. Плехавічуса) утварылі шэраг гарнізонаў на тэрыторыі паўночна-заходніх раёнаў Гродзеншчыны. Гітлераўцы падтрымлівалі антыпольскую і антыбеларускую дзейнасць літоўцаў.

Яшчэ з XV стагоддзя на тэрыторыі Беларусі пражывалі татары. У час гітлераўскай акупацыі адзначалася лаяльнасць татараў да немцаў і немцаў да татар (прыхільнікаў ісламу). Напрыканцы вайны яны выкарыстоўвалі некаторых прадстаўнікоў з беларускіх татараў у сваіх ваенна-палітычных мэтах. У маі 1944 г. быў створаны прагітлераўскі Саюз татарскай моладзі, але ён не паспеў разгарнуць сваю дзейнасць [10, с. 159; 5, с. 102–104]

825-ы "Остмусульманскі" батальён "Волга-татарскага легіёна" быў створаны гітлераўцамі ў жніўні-верасні 1942 г. з палонных татараў, башкіраў, мардвы, чувашаў і інш. Перад ім ставіліся задачы – барацьба з партызанамі, выведка і дыверсіі, прапагандысцкая праца па прыцягненню на гітлераўскі бок перабежчыкаў з ліку прадстаўнікоў розных народаў, арганізацыя антысавецкіх паўстанняў на тэрыторыі нацыянальных рэспублік. Акупанты вырашылі выкарыстаць батальён (каля 900 чал.) пры правядзенні карных аперацый на тэрыторыі Віцебшчыны. У лютым 1943 г. 825-ы

батальён перайшоў на бок савецкіх партызан. Як сцвярджае даследчыца Г. Шышкова, у татарскім народзе да сённяшняга часу жыва легенда аб тым, што татары пазбеглі пры Сталіне высылкі ў Казахстан і Сярэднюю Азію разам з іншымі народамі толькі дзякуючы таму, што адбыўся гэты пераход да партызанаў [23, с. 157–161].

Падзеі вайны 1941–1945 гг. значна абвастрылі нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў акупаванай Беларусі. У той жа час, рост значэння фактару этнічнасці для насельніцтва Беларусі і дзейнасць нацыянальных аб'яднанняў, якая ў асноўным мела культурна-дабрачынны характар, не прывялі да антаганістычных міжнацыянальных канфліктаў, як таго чакалі акупанты. Іх намаганні па культывацыі напружанасці паміж markednymі этнасамі не далі чаканых вынікаў. Варта пагадзіцца з высновамі даследчыкаў А. Кавалені і А. Мацко: "Нягледзячы на ўсю складанасць міжнацыянальных адносін, дэмаграфічных працэсаў, наяўнасць вострых супярэчнасцяў, якія прыводзілі часам да крывавых сутыкненняў і падзей, галоўнай рысай з'яўлялася мацнеючае антыфашысцкае адзінства народаў, што насялялі Беларусь, у змаганні супраць гітлераўскіх захопнікаў. Менавіта гэтая з'ява была адной з найважных крыніц перамогі над гітлераўскай Германіяй у вайне" [8, с. 54].

Нацыянальныя меншасці Беларусі разам з прадстаўнікамі тытульнага этнасу прынялі самы актыўны ўдзел у абарончых баях лета 1941 г., франтавых дзеяннях 1941–1945 гг. За лета 1941 г. з Беларусі было прызвана ў Чырвоную Армію 500–600 тыс. чалавек. З добраахвотнікаў, якія ня падлягалі прызыву ў войска, у Беларусі было створана 78 знішчальных батальёнаў (звыш 13 тыс. чал.) і больш за 200 фарміраванняў народнага апалчэння (больш чым 33 тыс. чал.), якія вялі барацьбу з дэсантамі ворага, шпіёнамі, ахоўвалі прамысловыя аб'екты, дзяржаўныя ўстановы, лініі сувязі і г.д. Вялікі ўклад ўнеслі ў стварэнне абарончых аб'ектаў і рубяжоў, дзе было занята каля 2 млн. чал. Актыўна ўдзельнічалі ў эвакуацыі матэрыяльных каштоўнасцей з рэспублікі на ўсход СССР. У адносна кароткі час з Беларусі было эвакуявана больш за 1,5 мільёна чалавек, больш за 120 прадпрыемстваў. Яны набліжалі перамогу, працуючы ў тыле СССР на эвакуяваных прадпрыемствах. Усяго на франтах вайны 1941–1945 гг. змагалася больш за 1,3 млн беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Значным быў іх уклад у барацьбу з акупантамі ў складзе савецкіх партызан і падпольшчыкаў Беларусі. Прадстаўнікі рускай нацыянальнасці разам з беларусамі з'яўляліся пераважнымі нацыянальнасцямі ў складзе савецкага антыгітлераўскай падполля ў Беларусі.

Калі абагульніць вядомыя дадзеныя за перыяд 1941–1944 гг. у партызанскіх фарміраваннях Беларусі нацыянальныя меншасці складалі 28,8% ад агульнай колькасці партызан рэспублікі: рускія – 19,3%, украінцы – 3,8%, яўрэі – 2,1%, палякі – 0,8% і 2,8% складалі прадстаўнікі 68 нацый і народнасцей СССР і замежных краін. Асноўную масу партызан Беларусі складалі беларусы і нацыянальныя меншасці, якія пражывалі тут у даваенны перыяд. У структуры падпольных арганізацый у сярэднім нацыянальныя меншасці складалі 25,7% ад агульнага ліку падпольшчыкаў: рускія – 17,1%, украінцы – 3,6%, палякі – 1,6%, яўрэі – 1,3%, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей – 2,1% [7, с. 109].

**Высновы.** У Беларусі існавалі розныя формы супрацоўніцтва з акупантамі пэўнай часткі насельніцтва. Да палітычнай калабарацыі адносяцца асобы, якія працавалі ў створаных акупантамі ці з іх дапамогай мясцовых адміністратыўных органах (старасты, бургамістры, юдэнраты і г.д.), грамадскіх арганізацыях, з'яўляліся дапаможнымі супрацоўнікамі нямецкіх акупацыйных органаў. Ваенная калабарацыя: а) мясцовы паліцэйскі апарат, служба парадку, дапаможныя ахоўныя паліцэйскія фарміраванні (у прыватнасці латышскія), чыгуначныя батальёны, "усходнія" батальёны, казацкія фарміраванні, агенты абвера, СД, ГФП, паліцыі, дапаможныя будаўнічыя і іншыя часткі; б) мясцовая самаахова (БКС, БКА), фарміраванні польскай АК і ўкраінскай АУН-УПА, якія супрацоўнічалі з немцамі, члены абарончых ваенных паселішчаў (абарончыя вёскі), рускія казацкія часткі, атрады Камінскага. Эканамічная (гаспадарчая) калабарацыя ўключае кіраўнікоў і служачых гаспадарчых органаў, прадпрыемстваў і арганізацый, якія функцыянавалі ў гады вайны, непасрэдна ці ўскосна працуючы на акупантаў. Частка беларусаў і прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей Беларусі былі ў складзе розных груп калабарантаў.

У перыяд акупацыі назіраліся адрозненні ў становішчы нацыянальных груп насельніцтва ў розных зонах акупаванай Беларусі. Найбольш актыўнымі ў Беларусі падчас гітлераўскай акупацыі ў адных рэгіёнах былі беларусы і рускія, у іншых палякі і ўкраінцы. Найменш цікавіліся "палітыкай" татары. Акрамя таго на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі нацыянальныя вайсковыя часці калабарацыяністаў, якія складаліся з асоб, якія не з'яўляліся мясцовымі жыхарамі і апынуліся тут пасля пачатку і ў ходзе вайны.

Нягледзячы на супрацоўніцтва часткі беларусаў і іншых этнічных супольнасцей з гітлераўскімі акупантамі, традыцыйныя добразычлівыя ўзаемаадносіны паміж прадстаўнікамі розных народаў Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны былі захаваныя. Яны ўмацаваліся ў выніку сумеснай барацьбы з агульным ворагам – гітлераўскімі захопнікамі.

1. Барабаш В. Поляки и другие национальные общности Гродненщины в годы гитлеровской оккупации / В. Барабаш // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. Матер. межд. науч. конф. – Гродно: ОО "Союз поляков на Беларуси", 2003. – С. 205 – 211.

2. Беляев А. Могилёвское городское управление в период немецко-фашистской оккупации (1941 – 1944) / А. Беляев // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва. Зб. нав. прац. – Магілёў, 2001. – С. 307 – 314.

3. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны). Учеб. пособие / Под ред. А.А. Ковалени, Н.С. Сташкевича. – Минск: Изд. центр БГУ, 2004.

4. Гісторыя Беларусі. Т. 5. Беларусь у 1917 – 1945 гг. – Мінск: Экаперспектыва, 2006.

5. Грыбава С.У. Палітыка нямецкіх улад у дачыненні да татарскага насельніцтва Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны / С.У. Грыбава // Віцебшчына ў 1941 – 1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць. Матэр. рэспубл. нав.-прак. канф. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”. – 2009. – С. 100 – 105.

6. Иоффе Э.Г. Страницы истории евреев Беларуси / Э.Г. Иоффе. – Минск: Арти-Фекс, 1996.

7. Каваленя А.А., Калеснікава А.А. Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941 – 1944 гг. (па матэрыялах БШПР) / А.А. Каваленя, А.А. Калеснікава // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі. Зб. нав. арт. – Мінск: БДПУ, 1998. – С. 77 – 90.

8. Коваленя А.А., Мацко А.Н. Национально-демографические процессы в Беларуси (1939 – 1945 гг.) / А.А. Коваленя, А.Н. Мацко // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі. Зб. нав. арт. – Мінск: БДПУ, 1998. – С. 30 – 56.

9. Котаў А.С. Дзейнасць рускай вызваленчай народнай арміі на Віцебшчыне / А.С. Котаў // Віцебшчына ў 1941 – 1944 гг. Супраціў. Вызваленне. Памяць. Матэр. рэспубл. навук.-практ. канф. – Віцебск: УА “ВДУ імя Машэрава”, 2009. – С. 97 – 100.

10. Крывашэй Дз. А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі ў перыяд германскай акупацыі (чэрвень 1941 – ліпень 1944) / Дз. А. Крывашэй. – Мінск: Беларуская навука, 2009.

11. Могилевское городское управление, 1941–1944 гг. Магілёў // Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці (ДАМаг). Ф. 260. Воп. 1. Спр. 104.

12. Новый путь, 1942. Бобруйск.

13. Новый путь, 1943. Могилёв.

14. Отчёт о работе медико-санитарного отдела // ДАМаг. Ф. 271. Воп. 1. Спр. 52.

15. Отчёт о работе Могилевского отделения белорусского общества “Народной самопомощи” // ДАМаг. Ф. 274. Оп. 1. Д. 5.

16. Отчёты, справки Епархиального отдела при Могилевском городском управлении // ДАМаг. Ф. 289. Оп. 1. Д. 1.

17. Пушкин И.А. Деятельность медицинских учреждений на территории Восточной Беларуси во время гитлеровской оккупации (на примере города Могилева) / И.А. Пушкин // Молодёжная Галактика. – 2014. – № 10. – С. 207 – 212.

18. Пушкин И.А. Тыловой район группы армий «Центр»: деятельность медицинских учреждений в условиях гитлеровской оккупации белорусско-российского пограничья (на примере города Могилева) / И.А. Пушкин // Studia internationalia. Матер. IV межд. научн. конф. «Западный регион России в международных отношениях X–XX вв.», 1–3 июля 2015 г. – Брянск: БГУ, 2015. – С. 336 – 343.

19. Пушкін І. А. Сацыяльнае, грамадскае і культурна-асветнае жыццё ў Магілёве падчас гітлераўскай акупацыі. 1941 – 1944 гг. / І. А. Пушкін // Проблемы славяноведения. Сб. научн. статей и материалов. Вып. 4. – Брянск: Изд-во Брянского гос. ун-та, 2002. – С. 228 – 237.

20. Саракавік І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мінск: “Современная школа”, 2006.

21. Тугай У.В., Грыгор’еў У.У. Адносіны латышоў да ваенна-палітычных падзей у Беларусі ў час Другой сусветнай вайны / У.В. Тугай, У.У. Грыгор’еў // Віцебшчына ў 1941 – 1944 гг. Супраціў. Вызваленне. Памяць. Матэр. рэспубл. нав.-практ. канф. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М.Машэрава”, 2009. – С. 48 – 52.

22. Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак. – Мінск: Беларусь, 1993.

23. Шишкова А.М. 825-й батальон “Волго-татарского легиона” и его переход на сторону партизан в феврале 1943 года / А.М. Шишкова // Віцебшчына ў 1941–1944 гг.: Супраціў. Вызваленне. Памяць. Матэр. рэспубл. нав.-практ. канф. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М.Машэрава”, 2009. – С. 157 – 161.

## References

1. Barabash V., 2003. *Polyaky y drugye nacyonal`nыe obshhnosty Grodnenshhy`nы v godы gy`tlerovskoj okkupacy`y`.* [Poles and other national communities in the Grodno region during the Nazi occupation]. Problemы nacy`onal`nogo soznany`ya pol`skogo naseleny`ya na Belarusy. Matery`alы Mezhdunar. nauch. konf. Grodno. OO “Soyuz polyakov na Belarusy”. S. 205 – 211 [in Bilorus].

2. Belyaev A., 2001. *Mogy`lëvskoe gorodskoe upravleny`e v pery`od nemeczko-fashy`stskoj okkupacy`y` (1941 – 1944)* [Mogilev city government during the Nazi occupation (1941 – 1944)]. Minulaya I suchasnaya gistorыya Magilëva. Zbornik navukovыx pracz. Mogilev. S. 307 – 314 [in Bilorus].

3. 2004. Vely`kaya *Otechestvennaya vojna sovetskogo naroda (v kontekste Vtoroj my`rovoj vojnы)* [The Great Patriotic War of the Soviet people (in the context of the Second World War)]. Ucheb. posoby`e pod red. A.A. Kovaleny`, N.S. Stashkevy`cha. My`nsk. Y`zd. centr BGU [in Bilorus].

4. 2006. *Gistorыya Belarusi. T. 5. Belarus` u 1917–1945 gg.* [History of Belarus. Vol 5. Belarus in 1917 – 1945.]. Minsk: Эkaperspektыva [in Bilorus].

5. Grыbava S.U., 2009. *Palitыka nyameczkix ulad u dachыnenni da tatarskaga nasel`nicztva Belarusi ў chas Vyalikaj Ajchыnnaj vajnы. Vicebshchыna ў 1941 – 1944 gg.* [The policy of the German authorities in respect of the Tatar population of Belarus during the Great Patriotic War. Vitebsk region in 1941 – 1944]. Supraciў. Vыzvalenne. Pamyacz`. Matэгыyalы rэspublikanskaj navukova-praktыchnaj kanferэnczыi. Vicebsk. UA "VDU imya P.M. Mashэrava". S. 100 – 105 [in Bilorus].

6. Y`offe Э.G., 1996. *Strany`czы y`story`y` evreev Belarusy`* [Pages of history of Jews in Belarus]. My`nsk. Arty`-Feks (in Bilorus).

7. Kavalenya A.A., Kalesnikava A.A., 1998. *Naczыyanal`na-dэmagrafichnыya praczэsы ў asyaroddzi belaruskix partыzan 1941 – 1944 gg. (pa matэгыyalax BShPR).* [National-demographic processes in the environment of the Belarusian partisans in 1941 – 1944 (According to the broadband wireless access)]. Naczыyanal`na-dэmagrafichnыya praczэsы na Belarusi. Zb. nav. art. Minsk. BDPU. S. 77 – 90 [in Bilorus].

8. Kovalenya A.A., Maczko A.N., 1998. *Nacy`onal`no-demografy`chesky`e processы v Belarusy` (1939–1945 gg.). art* [National-demographic processes in Belarus (1939-1945 gg.)]. Naczыyanal`na-dэmagrafichnыya praczэsы na Belarusi. Zb. nav. Minsk. BDPU. S. 30 – 56 [in Bilorus].

9. Kotaў A.S., 2009. *Dzejnascz` ruskaj vыzvalenchaj narodnaj armii na Vicebshchыne.* [The activities of Russian Liberation People's Army in the Vitebsk region]. Vicebshchыna ў 1941–1944 gg. Supraciў. Vыzvalenne. Pamyacz`. Matэгыyalы rэspublikanskaj navukova-praktыchnaj kanferэnczыi. Vicebsk. UA "VDU imya P.M. Mashэrava". S. 97 – 100 [in Bilorus].

10. Krыvashэj Dz. A., 2009. *Naczыyanal`nыya supol`nasci Belarusi ў perыyad germanskaj akupaczыi (chэrven` 1941 – lipen` 1944* [National Belarusian society during the German occupation (June 1941 – July 1944).]. Minsk. Belaruskaya navuka [in Bilorus].

11. 1941 – 1944. *Mogy`levskoe gorodskoe upravleny`e, 1941 – 1944 gg.* Magilov. [The Mogilev city administration, 1941 – 1944. Mogilev]. Dzyarzhavny arxiv Magilovska j voblasci (DAMag). F. 260. Vop. 1. Spr. 104 [in Bilorus].

12. 1942. *Novыj put`* [New Way]. Bobrujsk [in Bilorus].

13. 1943. *Novыj put`* [New Way]. Mogy`lёv [in Bilorus].

14. *Otchёt o rabote medy`ko-sany`tarnogo otdela* [Report on the work of health departments]. DAMag. F. 271. Op. 1. PRL. 52 [in Bilorus].

15. *Otchёt o rabote Mogy`levskogo otdeleny`ya belorusskogo obshhestva "Narodnoj samopomoshhy`"* [Report on the work of the Mogilev Branch of the Belarusian society "the People's self-help"]. DAMag. F. 274. Op. 1. D. 5 [in Bilorus].

16. *Otchёtы, spravky` Eparxy`al`nogo otdela pry` Mogy*`levskom gorodskom upravleny`y` [The report, reference the diocesan department of the Mogilev city management]. DAMag. F. 289. Op. 1. D. 1 [in Bilorus].

17. Pushky`n Y`.A., 2014. *Deyatel`nost` medy`cy`nsky`x uchrezhdeny`j na terry`tory`y` Vostochnoj Belarusy` vo vremya gy`tlerovskoj okkupacy`y` (na pry`mere goroda Mogy`leva*) [The activities of medical institutions in Eastern Belarus during the Nazi occupation (for example, the city of Mogilev)]. Youth Galaxy. 2014. № 10. S. 207 – 212 [in Bilorus].

18. Pushky`n Y`.A., 2015. *Tыlovoj rajon gruppы army`j «Centr»: deyatel`nost` medy`cy`nsky`x uchrezhdeny`j v uslovy`yax gy`tlerovskoj okkupacy`y` belorussko-rossy`jskogo pograny`ch`ya (na pry`mere goroda Mogy`leva)* [The rear area of the group ARMY "Center": the work of medical institutions in the condition of the Nazi occupation of the Belarusian-Russian border region (on the example of the city of Mogilev)]. Studia internationalia. Matery`alы IV mezhdunarodnoj nauchnoj konferency`y` «Zapadnыj regy`on Rossy`y` v mezhdunarodnыx otnosheny`yax X – XX vv.», 1 – 3 y`yulya 2015 g. Bryansk. RY`O BGU. S. 336 – 343 [in Russian].

19. Pushkin I. A., 2002. *Saczыyal`nae, gramadskae i kul`turna-asvetnae zhыczczё ў Magilёve padchas gitleraўskaj akupaczыi. 1941 – 1944 gg.* [Social, social, cultural and educational life in Mogilev during the Nazi occupation, 1941 – 1944]. Problemы slavyanovedeny`ya. Sb. nauchnыx statej y` matery`alov. Bryansk. Y`zd-vo Bryanskogo gosud. uny`versy`teta. Vыp. 4. S. 228 – 237 [in Russian].

20. Sarakavik I.A., 2006. *Gistoryya Belarusi ў kantэksce susvetnaj gistoryi* [History of Belarus in the context of world history]. Minsk. "Sovremennaya shkola" [in Bilorus].

21. Tugaj U.V., Grыgor'eў U.U., 2009. *Adnosinы latыshoў da vaenna-palitыchnыx padzej u Belarusi ў chas Drugoj susvetnaj vajnы.* [Latvian relations to the military-political developments in Belarus during World War II]. Vicebshchыna ў 1941 – 1944 gg. Supraciў. Vыzvalenne. Pamyacz. Matэгыyalы rэspublikanskaj navukova-praktыchnaj kanferэnczыi. Vicebsk. UA "VDU imya P.M. Mashэrava". S. 48 – 52 [in Bilorus].

22. Turonak Yu., 1993. Belarus` pad nyameczkaj akupaczыyaj [Belarus under German occupation]. Minsk. Belarus` [in Bilorus].

23. Shy`shkova A.M., 2009. *825-j batal`on "Volgo-tatarskogo legy`ona" y` ego perexod na storonu party`zan v fevrale 1943 goda.* [825 Battalion "Volga-Tatar Legion" and his desertion to the partisans in February 1943]. Vicebshchыna ў 1941 – 1944 gg. Supraciў. Vыzvalenne. Pamyacz`. Matэrыyalы rэspublikanskaj navukova-praktычnaj kanferэnczыi. Vicebsk. UA "VDU imya P.M. Mashэrava". S. 157 – 161 [in Bilorus].